Мацней трымаць штурвалы паветраных караблёў!

Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Чырвоная зьмена

№ 21 (1290) | АЎТОРАК, 27-га студзеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

ЧЫРВОНАШТАНДАРТНЫ ЛКСМ— шэф над ваеннымі паветранымі сіламі Рабоча-Сялянскай Чырвонай армії

Пастанова Рэвваенсавету Саюзу ССР

У сувязі з адзінадушна выказанай IX зьездам Усесаюзнага Ленінскага комуністычнага саюзу моладзі воляй аб прыняцьці з боку трохмільённай масы маладых будаўнікоў соцыялізму шэфства над ваеннымі паветранымі сіламі Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, Рэвалюцыйны Ваенны Савет СССР пастанаўляе:

Лічыць з 25-га студзеня 1931 г. чырвонаштандартны Ўсесаюзны ленінскі комуністычны саюз моладзі шэфам над паветранымі сіламі Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі.

Народны камісар па ваеным і марскім справам і старшыня РВС СССР Варашылаў

ЛЁС ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛУ НЕПАРЫЎНА ЗЬВЯЗАНЫ З ЛЁСАМ ВАЕННА-ПАВЕТРАНЫХ СІЛ РСЧА

„Новыя дзесяткі і сотні самалётаў, пабудаваных на грошы працоўных, комсамольцы-лётнікі і комсамол-шэф ваенна-паветраных сіл РСЧА,—будзе лепшым адказам на падкопы Пуанкарэ, Пілсудзкіх і ўсіх імпэрыялістычных драпежнікаў“

Адозва IX зьезду УсеЛКСМ войскам, камандзірам і політработнікам ваенна-паветраных сіл РСЧА. Усім комсамольцам Савецкага Саюзу

Таварышы! Мы ўступілі ў апошнюю стадыю нэпу і ў першы этап соцыялізму. Посьпехі пяцігодкі ўсяляюць веру ў сэрцы працоўных у шэрагі міжнароднага пролетарыяту і працоўных прыгнечаных калёній усходу і клічуць іх да самаадданай барацьбы за вызваленьне. Посьпехі пяцігодкі прыводзяць у шал загніваючы капіталістычны сьвет.

Прыкрываючыся наскрозь хлусьлівымі крыкамі аб міры, аб скарачэньні узбраеньняў, капіталісты ўсіх краін, як паказалі падзеі апошнік год, асабліва конфлікт на КУ чыг. і процэс „Промпартыі“, ліхаманкава рыхтуюцца да вайны супроць СССР, узбройваючыся да зубоў. Грозныя хмары вайны навісьлі над СССР. Як ніколі ажывілася дзейнасьць майстроў крывавых спраў—імпэрыялістых; з-за тонка дасьціпных прамоў прадстаўнікоў буржуазнай дыплёматыі раздаецца лязг зброі, чуцен пах пораху. У гады грамадзянскай вайны, на перадавых яе позыцыях, на сухазем'і, на моры і ў паветры комсамол крывёю лепшых сваіх сыноў пасьпяхова адстойваў заваёвы Кастрычніка, за што Рэввоенсавет рэспублікі быў узнагароджаны вышэйшай баявой узнагародай—ордэнам чырвонага сьцягу.

На V зьезьдзе саюз узяў шэфства над ваенна-морскім флётам і з таго часу непарыўнымі ўзамі вечна юны комсамол зьвязаны з жыцьцём слаўных ваенмораў, маральна і матар'яльна рацуючы баяздольнасьць рабоча-сялянскага чырвонага флёту. Апраўдваючы высокую назву шэфа рабоча-сялянскага ваенна-морскага флёту, чырвонаштандартны комсамол будзе і далей усямерна ўзмацняць яго. Мы разам з партыяй і ўсёй рабочай клясай краіны адказны перад пролетарыятам усяго сьвету за абарону СССР і абавязаны зрабіць яе цэнтральнай задачай сваёй работы.

Кожны малады працоўны, кожны малады рабочы і тым больш комсамолец павінен, усур'ёз заняўшыся сваёй ваеннай падрыхтоўкай, устанавіць яшчэ больш цесную сувязь з Чырвонай арміяй і флётам і ўзмацніць ім дапамогу. Мы павінны ясна ўявіць сабе, што будучая вайна будзе вайной клясаў, будзе, як ніколі, упартай і жорсткай з дагэтуль нябачанай тэхнікай зьнішчэньня, патрабуючай высокага ўзроўню падрыхтоўкі байцоў. Выдатную ролю ў гэтай вайне будуць граць мэханізацыя і моторызацыя РСЧА, броне-танкавыя часткі, марскі флёт і асабліва ваенна-паветраныя сілы, на ўмацаваньне якіх ленінскі комсамол павінен зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Перад тварам рэальнай пагрозы інтэрвэнцыі 9 зьезд УсеЛКСМ ад імя мільённай чырвонаштандартнай арміі ленінскага комсамолу пастанаўляе ўзяць шэфства над ваенна-паветранымі сіламі рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

Таварышы лётнікі і ўсе работнікі ваенна-паветраных сіл РСЧА! Да вас зварочваецца комсамол мацней трымайце штурвалы паветраных караблёў у сваіх руках, паляпшайце тэхніку, умацоўвайце організаванасьць і баяздольнасьць флёту, яшчэ больш зорка ахоўвайце неабдымныя прасторы Савецкага Саюзу ад крывавых спроб выскаліўшага зубы клясавага ворага. Ад гэтага часу лёс ленінскага комсамолу непарыўна зьвязаны з лёсам ваенна-паветраных сіл РСЧА, што абодвум надае яшчэ больш сілы, яшчэ больш баявой пролетарскай магутнасьці.

Слухайце, таварышы — комсамольцы! Шэфства над ваенна-паветраным флётам рабоча-сялянскай краіны накладае на вас вялізарныя абавязкі:

1. Мы павінны акружыць сваёй штодзённай пролетарскай увагай асабовы склад паветранага флёту і яго навучальна-вытворчую работу. Зьезд абавязвае ўсе організацыі комсамолу, сумесна з Асоавіяхэмам, безадкладна прыступіць к рабоце па пропагандзе значэньня шэфства, к барацьбе за авіяпісьменнасьць, разгортваньне шырокай сеткі прасьцейшых школ, куткоў і гурткоў па вывучэньню авіясправы (падрыхтоўка ў школы ВВС, пляянэрныя і модэльныя работы і г. д.) політыка-культурнаму абслугоўваньню частак ваенна-паветраных сіл, устанавіць з імі жывую і пісьмовую сувязь.

2. Праз сыстэматычную політыка-асьветную работу мы павінны дабіцца яшчэ больш высокага ўзроўню баяздольнасьці, дысцыплінаванасьці і ідэолёгічнай устойлівасьці асабовага складу ваенна-паветраных сіл, яшчэ больш цесна яднаючы іх на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

3. Пастаяннае ўдасканальваньне чырвонага ваеннага паветранага флёту, заахвочваньне вынаходніцтва, рацыяналізатарства і конструктарства, разьвіцьцё ўдарніцтва і соц. спаборніцтва на лепшы паказ у вучэбна-баявой і вытворчай рабоце—павінна быць прадметам сталых клопатаў ленінскага комсамолу. Унясем у гэтую справу комсамольскі энтузіязм і вытворчую нотку, выпрабаваныя ў барацьбе за прамфінплян.

4. Асабліва сур'ёзна заняцца комплектаваньнем войск і паветраных сіл у школах лётнікаў і малодшых спэцыялістых па акадэміі, організаваць падрыхтоўку да паступленьня ў іх лепшых комсамольцаў. Комсамолец— на самалёт!—вось наш баявы лёзунг.

5. Даючы паветранаму флёту комсамольцаў—актывістых—будучых тэхнікаў, інжынэраў, борт-мэханікаў і лётнікаў, комсамол павінен даць і самалёты. Зьезд бярэ на сябе абавязацельства—папоўніць чырвоны паветраны флёт новымі комсамольскімі самалётамі. Комсамольцы і рабочая моладзь авія-прамысловасьці! Зьезд кліча вас з падвойнай энэргіяй, беззаветнай самаадданасьцю змагацца за выкананьне і перавыкананьне пляну па ўсіх паказчыках. Зьезд заклікае кожную ячэйку, кожнага комсамольца клапаціцца аб ваенна-паветраным флёце. Хто ня выконвае сваіх шэфскіх абавязкаў ваеннаму, паветранаму і марскому флёту, той ня вярты высокага званьня члена ленінскага комсамолу. Новыя дзесяткі і сотні самалётаў, пабудаваных на грошы працоўных, комсамольцы—лётнікі і комсамол — шэф ваенна-паветраных сіл РСЧА,—будзе лепшым адказам на падкопы Пуанкарэ, Пілсудзкіх і ўсіх імпэрыялістычных драпежнікаў сьвету. Няхай-жа з кожным месяцам расьце і мацнее ваенна-паветраны флёт, усё часьцей і цясьней пропэлеры савецкіх самалётаў рэжуць паветра. Мацней гучыць наша песьня: „Все выше, и выше стремим мы полет наших птиц, и в каждом пропеллере дышет спокойствие наших границ“. Комсамольцы, маладыя рабочыя і сяляне, рыхтуйцеся да абароны СССР, мацуйце магутнасьць ваенна-паветраных сіл РСЧА;

Няхай жыве пільны вартавы Савецкага Саюзу—баявы паветраны флёт!

Няхай жыве 3-хмільённы чырвонаштандартны ленінскі комсамол і яго правадыр—бальшавіцкая партыя!

Няхай жыве сусьветная рэволюцыя

Пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, непрымірыма змагаючыся з клясавым ворагам і рознымі ўхіламі ад лініі партыі,—будзем у першых шэрагах барацьбітоў за скончэньне пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР

Рэзолюцыя IX зьезду ЎсеЛКСМ па дакладу тав. Кагановіча

Заслухаўшы і абгаварыўшы даклад тав Кагановіча аб міжнародным і ўнутраным становішчы Савецкага Саюзу, IX зьезд УсеЛКСМ ад імя мільёнаў пролетарскай і працоўнай моладзі заяўляе аб самаахвярнай адданасьці ленінскага комсамолу генэральнай лініі партыі, праводзімай яе Цэнтральным Камітэтам.

Зьезд цалкам ухваляе ўсю політыку і практыку партыі і яе ЦК, накіраваныя на няўхільнае ажыцьцяўленьне гэтай лініі. Толькі дзякуючы няўхільнаму ажыцьцяўленьню ленінскай лініі партыі яе Цэнтральным Камітэтам, пролетарыят і працоўныя СССР дамагліся рашаючых посьпехаў у соцыялістычным будаўніцтве, яшчэ больш узмацнілася магутнасьць СССР, як апоры ўзрастаючай міжнароднай пролетарскай рэволюцыі, дасягнуты гіганцкія перамогі на фронце соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны, перавыкананы плян першых двух год пяцігодкі, павялічыўся матар'яльны і культурны ўзровень рабочых і працоўных мас краіны.

На аснове правядзеньня правільнай ленінскай лініі партыі дасягнуты паварот бядняцка-серадняцкіх мас вёскі на шлях соцыялізму, на шлях колгасаў, што дазволіла партыі перайсьці ад політыкі выцясьненьня і абмежаваньня эксплёататарскіх тэндэнцый кулака да ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі. Зьезд констатуе, што колгасны рух у пэрыод пасьля XVI зьезду партыі, паказвае далейшы, новы, яшчэ большы рост і прасоўваньне ўперад усяе справы соцыялістычнага будаўніцтва. Ленінскае пытаньне „хто-каго“ ўжо вырашана ў карысьць соцыялізму ў прамысловасьці і таксама пасьпяхова вырашаецца ў карысьць соцыялізму і ў галіне сельскае гаспадаркі. Соцыялістычны сэктор заняў пераважнае месца ў нашай экономіцы. Краіна ўступіла ў пэрыод соцыялізму. Дзякуючы ўсім гэтым посьпехам соцыялізм з далёкай пэрспэктывы зрабіўся практыкай сёньнешняга дня, а маладому пакаленьню рабочых і сялян нашай краіны выпаў гонар яго канчатковага завяршэньня.

Зьезд констатуе, што гэтых сусьветна гістарычных заваёў соцыялізму партыя дамаглася толькі бязьлітасна зьнішчаючы правых опортуністых, як галоўную небясьпеку на даным этапе і „левыя“ паўтроцкісцкія ўхілы, што ўзмацняюць позыцыі правых, а таксама рознага роду прымірэнчыя і двурушніцкія элемэнты ў партыі, комсамоле, асабліва ў профсаюзах і саветах. Партыя пад кіраўніцтвам свайго ЦК дала зьнішчальны адпор двурушніцкаму права-„левацкаму“ блёку Сырцова, Ломінадзэ, Шацкіна, выступаўшаму на плятформе правага опортунізму супроць генэральнай лініі партыі і яе ленінскага кіраўніцтва. Банкрутамі аказаліся і правыя элемэнты—падгалоскі кулацтва, а таксама троцкістыя і паўтроцкістыя клікушы—агенты класавага ворага.

Зьезд вітае барацьбу партыі і яе ЦК супроць права-ўхілісцкай практыкі Бухарына, Рыкава і Томскага, да канца выкрытай і прымушанай капітуляваць перад патрабаваньнем партыі і ўсяе рабочае клясы. Разгром правых і „левых“ груп у той-жа час ні ў якім разе не зьмякчае задачы барацьбы з опортунізмам на два фронты. Зьезд з вялізарнейшым здаваленьнем адзначае, што ў гэтай незамірнай барацьбе на два фронты, супроць кулацкай агентуры—правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі, а таксама і супроць „левакоў“ і прымірэнцаў,—комсамол быў, ёсьць і будзе лепшай і самай надзейнай апорай партыі. Працягваючы барацьбу з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай, неабходна ў той-жа час мець на ўвазе, што ў моц больш шырокага соцыяльнага складу комсамолу і яго меншай загартаванасьці, у параўнаньні з партыяй, у паасобных зьвеньнях УсеЛКСМ могуць яшчэ праяўляцца рэцыдывы як правых настрояў, так і асабліва ўяўнай рэвалюцыйнасьці (тыпу Шацкіна-Стэна), на барацьбу з якімі ленінскі комсамол пад кіраўніцтвам партыі павінен заўсёды мобілізоўваць увагу моладзі.

IX зьезд УсеЛКСМ ад імя 3-хмільённай організацыі комсамолу дае цьвёрдае і непарушнае абяцаньне і надалей быць першым дапаможнікам партыі ў бязьлітаснай барацьбе за чыстату ленінскай генэральнай лініі, за монолітнасьць і жалезную згуртаванасьць шэрагаў ЎсеКП(б), супроць усіх опортуністычных наскокаў, супроць усялякіх вылазак кулацкай агентуры, супроць усялякіх элемэнтаў прымірэнцтва.

IX зьезд УсеЛКСМ адзначае, што народна-гаспадарчы плян соцыялістычнага будаўніцтва на 1931 г.— 3-ці год пяцігодкі—зьяўляецца плянам новых перамог пролетарыяту СССР і яго партыі, перамог, маючых сусьветнае гістарычнае значэньне. Выкананьне пляну трэцяга году—рашаючага году пяцігодкі —павінна завяршыць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі ў нашай краіне. Вялізарнейшыя задачы, паказаныя ў народна-гаспадарчым пляне трэцяга году пяцігодкі, ацьверджаныя студзеньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б), дапоўненыя вялізарнымі задачамі ў галіне культурнага будаўніцтва (правядзеньне ўсеагульнага навучаньня, шырокая падрыхтоўка кадраў, політэхнізацыя школы і інш.), зьяўляюцца разам з тым плянам работы комсамолу на надыходзячы год. Уступленьне ў пэрыод соцыялізму, трэці год пяцігодкі ставіць перад усімі організацыямі рабочае клясы.—у тым ліку і перад ленінскім комсамолам, — павышаныя, яшчэ больш складаныя задачы, якія атрабуюць далейшага ўзмацненьня тэмпаў і ўздыму якасьці работы на больш высокую ступень.

Ленінскі комсамол, які зьявіўся ініцыятарам разьвіцьця соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, павінен пад кіраўніцтвам партыі яшчэ больш разгортваць магутную зброю барацьбы за пяцігодку ў чатыры гады—соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, узьнімаючы яго на якасна больш высокую ступень, усямерна разьвіваючы гэткія яго формы, як грамадзкія буксіры, плянавыя групы, сустрэчныя прамфінпляны і, накіроўваючы шматмільённы рух ударніцтва і соцспаборніцтва на вырашэньне такіх павышаных задач трэцяга году, як плянаваньне, рацыяналізацыя, асваеньне новай тэхнікі і зьвязаная з гэтым барацьба за якасныя паказчыкі вытворчасьці. Зьезд запэўнівае партыю і яе Ленінскі ЦК, што дамогшыся павароту тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі, выкоўваючы новую дысцыпліну працы, комсамол здолее на трэці год пяцігодкі непамерна павялічыць якасьць сваёй гаспадарчай работы, узьняць яе на больш высокую ступень, накіраваць актыўнасьць пролетарскай і працоўнай моладзі на аўладаньне паказанымі рашаючымі падважнікам індустрыялізацыі, (плянаваньне, рацыяналізацыі, асваеньне новай тэхнікі) і на аўладаньне. у першую чаргу такімі баявымі, вузлавымі вучасткамі соцыялістычнай будоўлі, як транспорт, вугаль, мэталь, новыя пабудовы, электрофікацыя, жывёлагадоўля, рабочае забясьпечаньне і работа коопэрацыі.

Зьезд надае выключнае значэньне ўдзелу комсамолу ў вырашэньні проблемы кадраў. Комсамол, які зьяўляецца важнейшай крыніцай па дастаўве новых кадраў для соцыялістычнага сэктору народнае гаспадаркі і для савецкага апарату, абавязаны работу па падрыхтоўцы кадраў зрабіць сваёй

(Працяг гл. на 4 стар.)

Чырвонафлёцец АДЧА чырвонасьцяжнік тав. Мукасееў Д.—дэлегат IX-га зьезду ЎсеЛКСМ.

РЭКОРД ОПОРТУНІСТЫЧНАГА ПРЫТУПЛЕНЬНЯ

„Дабрадушша“ і прымірэнцтва да варожай ідэолёгії і вылазак у колектыве ЛКСМБ Менбелпэдтэхнікуму

У кіраўніцтва „зацясаліся“ опортуністычныя прымірэнчыя элемэнты

Ачысьціць колектыў ад кулацкай агэнтуры, забясьпечыць разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі і мобілізацыі комсамольскіх і студэнцкіх мас на хутчэйшую і добраякасную падрыхтоўку пэдагогічных кадраў

Аказваючы жорсткае супраціўленьне нашаму наступленьню, клясавы вораг працягвае свае шчупальцы і ў навучальныя ўстановы, каб так ці інакш, непасрэдна ці праз сваю агэнтуру зрываць нашы мерапрыемствы па падрыхтоўцы патрэбных соцыялістычнаму будаўніцтву пролетарскіх кадраў.

Мы ведаем, што контррэволюцыйныя беларускія нацыянал-дэмократы, імкнучыся выхоўваць нацыянал-дэмакратычную інтэлігенцыю працягвалі свае ідэі ў навучальныя ўстановы.

„Яшчэ пры шэфстве Ігнатоўскага...

Беларускі Пэдтэхнікум у Менску, шэфам якога доўгі час зьяўляўся выключаны зараз з партыі нацыянал-опортуністы **Ігнатоўскі**, значна „окупаваўся“ ўплывам нацыянал-дэмократаў. Працягваньне нацыянал-дэмократычных ідэй у тэхнікуме выяўлялася і ў спробах замены такіх інтэрнацыянальных тэрмінаў, як „ударныя брыгады“ нацыянал-дэмократычнымі—„уцяльныя брыгады“ і г. д. У тэхнікуме выдаваўся наскрозь атручаны нацыянал-дэмократызмам часопіс „Крыніца“, сама назва якога гаворыць за сябе.

Як ужо пісала „Чырвоная Зьмена“ у №290 ад 16 сьнежня 1930 году, у тэхнікуме мелі месца нават організаваныя нацыянал-дэмократычныя вылазкі групы **Вышыны, Астрэйкі, Гайкі**. Гэта група імкнулася давесьці „аполітычнасьць літаратуры“. Яны ня толькі разглядалі творы выключна з „мастацкага боку“, адхіляючы іх соцыяльны зьмест—тэматыку, але-ж адкрыта заяўлялі, што літаратура не павінна адбіваць нашага будаўніцтва. Напрыклад, адзін з „лідэраў“ гэтай групы Гайка так і заяўляў: „літаратура не павінна адбіваць колгаснага будаўніцтва“.

Сама па сабе характарыстыка дзейнасьці гэтай групы бяз лішніх комэнтарый гаворыць куды яна цягнула літгуртов супрацьстаўляючы яго дзейнасьць партыйнай лініі.

І пасьля таго, як гэта група была разьбіта, удзельнікі не выкінуты з комсамолу, а некаторыя з тэхнікуму, усё-ж такі Вышына спрабаваў аформіць на 3 курсе другую групу...

Гэтыя ўсім вядомыя контррэволюцыйныя вылазкі „маладых нацыянал-дэмократаў“ былі нічым іншым як адкрытай атакай агэнтуры клясавага ворага на лінію партыі ў тэхнікуме.

І на сёньняшні дзень, калі ўся контррэволюцыйная сутнасьць беларускага нацыянал-дэмократызму ўжо выкрыта і пацьверджана дакумэнтальна, калі партыя і рабочая кляса нанесла руйнуючы ўдар па беларускім нацыянал-дэмократызьме, нацыянал-дэмократычная ідэолёгія ў тэхнікуме ўсё-ж мае свае праявы. Гэта выяўляецца і ў спробах ідэалізаваць правадыроў буржуазнага нацыяналістычнага руху старажытнай Беларусі, як пролетарскіх. Камісія па праверцы беларусізацыі сустрэлася напрыклад, з фактам, калі студэнткі Пятроўская і Вяргулава лічаць Кастуся Каліноўскага пролетарскім рэволюцыянэрам.

Вылазкі вялікарасійскага шовінізму

Нацыянал-дэмократычную ідэолёгію ў тэхнікуме жывяць праявы і вылазкі вялікадзяржаўнага шовінізму. Правядзеньне беларусізацыі не дало належных вынікаў у тэхнікуме. Організацыі тэхнікуму зьвярнулі яўна не выстарчальную ўвагу на беларусізацыю. Паказчыкам гэтага можа служыць хаця-б і такі факт, што на 3-м дашкольным курсе 50 прац. студэнцтва кепска ўжывае беларускую мову. Студэнтка 2-га курсу Вяргулава адмаўляецца гаварыць па-беларуску. Комсамолец **Івашын** студэнт 3-га курсу, упарта не карыстаецца беларускай мовай і за гэта ад курсавой ячэйкі атрымаў вымову. Студэнт **Карачэўскі** заяўляе, што „белорускі язык хуже рвотного порошка“.

Ёсьць шэраг фактаў і пасыўнага супраціўленьня беларусізацыі з боку значнай часткі студэнтаў, настаўнікаў і абслугоўваючага пэрсоналу (Сьцепановіч, Фрыдман, Сьмірнова і інш.). Маецца і неразуменьне задач беларусізацыі, імкненьне правесьці яе ў два шчоты, думкі аб тым. што беларусізацыя ўжо скончана. Сэкратар комсамольскага колектыву тэхнікуму, тав. Каган, так і заявіў, „белорусізацыя ўжо скончана“.


Усе гэтыя факты нельга інакш расцэньваць, як самыя што ні на ёсьць махрозыя праявы вялікарасійскага шовінізму, які, жывячы контррэволюцыйны беларускі нацыянал-дэмократызм, пры яго дапамозе, атакуе мерапрыемствы партыі па падрыхтоўцы пролетарскіх пэдагогічных кадраў.

Здавалася-б, што, улічваючы гэта, комсамольскі колектыў Белпэдтэхнікуму павінен быў забясьпечыць мобілізацыю мас комсамольцаў і беспартыйнага студэнцтва на няпрымірымую барацьбу з усякімі варожымі вылазкамі ў тэхнікуме. І вось, наколькі гэта зроблена, мы зараз упэўнімся на фактах:

Варожыя атакі і прымірэнцы

Яшчэ ў пачатку кастрычніка 1930 году студэнты трох менскіх пэдтэхнікумаў—беларускага, польскага і яўрэйскага—выяжджалі на працу ў колгас імя Х-годзьдзя БССР. Брыгады для працы былі чамусьці разьбіты па нацыянальнаму прынцыпу, і гэта было выкарыстана клясавым ворагам для ўнясеньня нацыянальнай розьні варожасьці паміж брыгадамі. Адсюль мелі месца факты шовінізму і антысэміцкая вылазка комсамольца-студэнта Белпэдтэхнікуму Буксы. Гэты Букса абзываў студэнтаў яўрэйскага пэдтэхнікуму „інтэлігенцыяй з сялёдачнага рассолу“. Трэба сказаць, што гэтая антысэміцкая, па сутнасьці контррэволюцыйная вылазка ня толькі не знайшла ніякага рэагаваньня на месцы, але-ж і пры падвядзеньні вынікаў работы ў колгасе на бюро колектыву 14/X—30 г. аб гэтай вылазцы, як і аб іншых фактах шовінізму, ніхто нават і не ўспамянуў. Яна была пакрыта недаацэнкай і прымірэнцтвам ня толькі з боку комсамольцаў, якія працавалі тады ў колгасе, але і актыву—членаў бюро колектыву Герасімчыка і Красоўскага, якія, нават пасьля таго як супроць гэтага факту выступіла газэта „Орка“ і ён быў з усёй паўнатою выкрыты, выступалі з імкненьнямі змазаць контррэволюцыйную сутнасьць антысэміцкай вылазкі Буксы.

Але-ж гэта ня ўсё. Комсамолец **Восіпчык** выступіў з варожай заявай і спрабаваў „давесьці“, што „бедняк жыве лепш за кулака“. Для нас зусім зразумела, што над такой „заяўкай“ гэты кулацкі абаронца паказваў клыкі супроць мерапрыемстваў партыі па барацьбе з кулацтвам, па ліквідацыі яго як клясы на аснове суцэльнай колектывізацыі.



Варожыя сьцевы і „дабрадушнае“ кіраўніцтва.

Комсамолец **Ждановіч** з гэтага-ж курсу выказаў па сутнасьці троцкісцкія погляды „аб неабходнасьці раскулачваньня сераднякоў“. **Бюро цэх'ячэйкі першага курсу ня толькі не дало політычнай ацэнкі гэтым заявам, але-ж вынесла дзяляцкую пастанову** і параўнала разгляд політычна шкодных вылазак **Восіпчыка** і **Ждановіча** з абвінавачваньнем студ. **Пяцірэйціса** за кепскае распараджэньне коопэрацыйнымі талёнамі.

Такая політычная сьлепата ячэйкі не выпадкова. Замкнуўшыся ў свае вузкія рамкі дзяляцтва ў час падрыхтоўкі да комсамольскіх зьездаў ячэйка не знайшла патрэбным прапрацаваць варожай сутнасьці права-опортуністычных вылазак у комсамоле тыпу Мінаева, Бутыркіна і Целешава.

Студэнт II-га курсу **Беразоўскі** вывешваў у агульнажыцьці лёзунгі: „Вучыся перад усім затрудняцца“, „Ленінская ўстаноўка кажа: 15 вызначай. а 5 выконвай“. Гэтыя варожыя лёзунгі яшчэ вісяць у агульнажыцьці. Як ячэйка II-га курсу, так і комсамольскі колектыў аказаліся „бясьсільнымі“ зьняць гэтыя лёзунгі і выкрыць іх шкоднасьць.

Комсамолец двухгадовых пэдкурсаў **Дзякоў**, каб працягнуць свае варожыя погляды на партыйнае кіраўніцтва, выступіў у ролі „сыгналізатара“, абвінавачваючы ЦК УсеКП(б) „у позьнім выданьні адозвы“.

Хаця гэтае выступленьне было абгаворана на куставой ячэйцы і яна выключыла **Дзякова** з комсамолу, **але яшчэ не пастаўлена і не абгаворана на сходзе колектыву. Колектыў супроць яго не мобілізаваны.**

„Соцспаборніцтва патрэбна для вытворцаў“

Варожая ідэолёгія выявілася ня толькі ў варожых і шкодных вылазках, але і ў спробах сарваць работу і соц. спаборніцтва ў тэхнікуме. За адзін толькі лістапад месяц 1930 году зроблена 225 прагулаў. Гэта трывожная лічба. Злосныя прагульшчыкі маюцца і сярод комсамольцаў, як напрыклад: **Галовіч, Дзятловіч, Ждановіч, Дубовік, Жаковіч** і інш. Маюцца факты, калі соцспаборніцтва стараюцца зрабіць нікчэмным; спаборнічаюць на лепшую запраўку ложка, выхалашчваючы з яго вытворчае прызначэньне

Больш таго. Мы маем факты адкрытых опортуністычных выступленьняў супроць соц. спаборніцтва ў тэхнікуме. Комсамолец двухгадовых пэдкурсаў **Тоўсты** каб давесьці непатрэбнасьць соц.спаборніцтва ў тэхнікуме, заяўляе: „Я лічу, што соц.спаборніцтва патрэбна для вытворцаў, якія вытвараюць продукт, а не для продукту, які вытвараецца вытворцам“. Ён-жа адмовіўся замацавацца на пэдагогічнай працы пасьля сканчэньня тэхнікуму.

На гэтых пэдкурсах з 55 комсамольцаў—20 ударнікаў. Сам сэкратар ячэйкі **Мялешка** не зьяўляецца ўдарнікам. **Гэты-ж Мялешка прымірэнча аднёсься да контррэволюцыйнай вылазкі групы нацыянал-дэмократаў Астрэйкі і К-о** і не мобілізаваў масы сваёй ячэйкі на барацьбу з імі.

Неабходна падкрэсьліць, што бюро калектыву ЛКСМБ, заслухоўваючы справаздачу ячэйкі двухгадовых пэдкурсаў, не дало політычнай ацэнкі права-опортуністычнай практыкі кіраўніцтва ячэйкі, а вынесла змазваючую сапраўднае становішча і прымірэнчую пастанову. Сэкратар ячэйкі Мялешка, які адмовіўся ўступіць у спаборніцтва і ўдарніцтва, прымірэнец да нацыянал-дэмократычных вылазак, ня быў зьняты з працы, а пакінуты ў кіраўніцтве.

Факты падобнага становішча соц. спаборніцтва мы маем і на іншых курсах. На III-м курсе ёсьць зрыўшчыкі соц. спаборніцтва. Комсамолец Гомза ўступіў ва ўдарную брыгаду толькі пасьля вымовы ад ячэйкі.

Комсамольцы-студэнты ня прымаюць удзелу ў прадметных камісіях. Консультацыя і дапамога для адстаючых ня існуе. Лепш пасьпяваючыя студэнты часта адмаўляюцца прыняць у сваю брыгаду адстаючых.

У кіраўніцтве—опортуністыя

Мы павінны асабліва падкрэсьліць, што большасьць кіруючага актыву, замест даць рашучы адпор усім гэтым фактам, сама зрывае работу ў тэхнікуме. Група комсамольцаў-актывістых, студэнтаў 2-га курсу: Красоўскі-сэкратар курсавой ячэйкі, член бюро колектыву ЛКСМБ і профкому, Ансон кандытат бюро колектыву ЛКСМБ і член профкому, Мароцкі член профкому, Ліхадзяеўскі-член профкому, Прохарчык і Солаў, —дэмонстрацыйна сарвалі лекцыю. Калі гэта пытаньне разглядалася на бюро колектыву, то яны прадстаўляючы там большасьць, правялі ў сваю карысьць пастанову.

Ня гледзячы на тое, што парт'ячэйка выступіла супроць пастановы колектыву, кваліфікавала яе, як опортуністычную і выказалася за вывад зрыўшчыкаў з кіраўніцтва колектыву, усё-ж яны, пры пераглядзе гэтай справы на бюро колектыву ў другі раз, правялі сваю лінію. Гэтага дабіліся і на сходзе, і ў ві... ніку-засталіся ў кіраўніцтве коле... тыву. Варта падкрэсьліць, што г... ядро і ў мінулым сваімі пасыўны... адносінамі і ўласным паруш... працдысцыпліны падтрымлівала ўс... кія дэзорганізатарскія настроі... курсе.

Адсюль зусім не выпадковы а... значаныя ўжо факты прымірэнц... з боку бюро колектыву да варож... вылазак і правай практыкі. У пр... ватнасьці невыпадковым зьяўляе... факт прымірэнчай пастановы і... справаздачы ячэйкі ЛКСМБ 2-... курсу, сэкратаром якое—знаё... нам Красоўскі. У гэтай пастано... адзначан шэраг буйных прарываў... рабоце ячэйкі, якія маглі здарыц... толькі ў выніку права-опортуністы... най практыкі кіраўніцтва, але... гэтым прарывам ня дана патрэбн... політычнай ацэнкі. Сэкратар ячэ... кі Красоўскі—прымірэнец да ант... сэміцкіх і шовіністычных выла... у час працы ў колгасе імя Х-ці... дзьдзя БССР, удзельнік зрыву лекцы... —ня быў зьняты з кіраўніцт... ячэйкі і колектыву.

Усе пералічаныя факты д... юць нам поўны малюнак політы... нага твару комсамольскага кіра... ніцтва Белпэдтэхнікуму. Аказаўш... ся ў значнай частцы ў руках опо... туністычных і прымірэнчых эл... мэнтаў, кіраўніцтва не забясьпеч... ла мобілізацыі мас комсамольца... беспартыйнага студэнцтва на н... прымірымую барацьбу з варож... вылазкамі ў тэхнікуме, не мобі... завала масы на хутчэйшую і д... раякасную падрыхтоўку пэдагагічн... кадраў. Яно праводзіла права-опо... туністычную практыку, яно схілі... галаву перад атакамі ворага.

Слова за самакрытыкай

Культэстафэта і месячнік прав... кі беларусізацыі комсамольскім к... лектывам ня выкарыстаны д... мобілізацыі мас комсамольцаў і ст... дэнцтва на організацыю рашуч... удараў па варожых вылазках, ... больш пасьпяховае зьдзейсьнен... задач удзелу колектыву ў н... культбудаўніцтве. Культэстафэ... праведзена аднабока, комсамольс... колектыў і організацыя тэхнікум... абмяжаваліся галоўным чынам в... лучэньнем культармейцаў, ды і ... без праверкі іх работы. Культэс... фэта для дасягненьня зруху ... усёй унутранай рабоце тэхнікум... ня была выкарыстана.

А дзе-ж была ў такім выпа... самакрытыка? Аб становішчы сам... крытыкі мы можам меркаваць ... усяго сказанага. Яна не зьяўляла... зброяй барацьбы з варожымі выла... камі і прымірэнцтвам. Лепшым п... цьвярджэньнем гэтага зьяўляец... тое, што да гэтага часу ня зьнят... з комсамольскага кіраўніцтва опорт... ністычныя і прымірэнчыя элемэнт...

Партыйная ячэйка прагляд... усе гэтыя факты і не зрабіла сва... часова патрэбных вывадаў.

Опортуністычнае кіраўніцтва ко... самольскай організацыі тэхнікум... павінна быць неадкладна распуш... на. Комсамольскія і студэнцкія м... сы павінны быць мобілізаваны ... найлепшае ажыцьцяўленьне ў сва... штодзённай рабоце задач партыі ... падрыхтоўцы пэдагогічных кадра... рашэньняў апошніх комсамольс... зьездаў: Х ЛКСМБ і IX УсеЛКС...

М. Жыр.

МЫ ЗНОЙДЗЕМ ВАС, БЛАГІЯ КАМІСАРЫ!

Тав. Зантовіч! Адказвай:


Чаму 12-га студзеня цягнік № 102 адышоў на Асіпавічы са спазьненьнем на 40 хвілін?
Чаму бяз пляну падаюцца цягнікі для набору апалу і 12-га студзеня паравоз прастаяў 7 гадзін?
Чаму няма апалу ў майстэрнях малога рамонту?
Чаму марынуюцца рабочыя рацыяналізатарскія прапановы?
Чаму ня выжыты спазьненьні, нядбайства—шкодніцтва? Чаму?

Памятайце:

„Мы маем цяжкасьці на транспорце. Транспорт адстаў. Ён гіганцкі вырас у параўнаньні з намечанай праграмай, але адстаў у параўнаньні з патрабаваньнямі, якія яму прад'яўляюць, ён адстаў у сваёй організацыі, ён адстаў у сваім кіраўніцтве... Віною ў цяжкасьцях на транспорце—больш за ўсё няўменьне організаваць справу. У большасьці гэтыя цяжкасьці залежаць ад таго, што людзі сыпаліся з розныя перасадкамі, неабдуманымі рэформамі, ня ўмелі прапрацаваць і расставіць людзей, сваіх людзей.

На транспорце мы маем і своеасаблівыя формы клясавай барацьбы. Кулацкія элементы ў шэрагах транспартнікаў імкнуцца шкодзіць нам, зрываць нашу працу

Вось чаму партыйныя організацыі, комсамольскія організацыі павінны ўзмацніць клясавую бадзёльнасьць, змагацца за працоўную дысцыпліну, каб захаваць паравозны парк, змагацца за ашчаднейшыя адносіны да паравозаў. Бяз гэтага мы, таварышы, ня здолеем падняць на патрабную вышыню транспорт. ЦК УсеКП(б) распрацаваў шэраг захадаў, і мы думаем, што комсамол гэтыя захады ў справе барацьбы за палепшаньне транспорту актыўна падтрымае" (з прамовы Кагановіча на IX зьезьдзе УсеЛКСМ).



Дамо поўны ход!

Калі не мабілізаваны масы

...троцім, рашаючым годзе пяцігодкі грузазварот чыгункі значна ...ышаны і павінен перавысіць грузазварот 1930 году на 100 ...ёнаў тон.

...ле галоўным тормазам у выка...ні пляну ўзрослага грузазвароту ...ляецца нездавальняючае стано...ча паравознага парку.

Ды і сапраўды

Менскім паравозным парку ...лічваўся процант хворых пара...оў, значна нагоршыўся якасьць ...монту, адчуваецца недахоп за...ных частак.

...адзвычайна дрэнна пастаўлены ...нава-папераджальны рамонт. Не...часова і нерэгулярна адбываецца ...чая прамыўка паравозаў. Усё ...выклікае вялікія прастоі ў ...онце паравозаў. Барацьба за ...ачэньні прастояў ў рамонце ня ...зана з барацьбою за добрую ...сьць рамонту.

...аспадарча-профэсыйныя і грама...я організацыі чыгункі ў сваёй ...ктычнай дзейнасьці недаацанілі ...ітычнага значэньня барацьбы за ...ровы паравоз.

...а гэтага часу не разгорнута ...рокая масава-растлумачальная ...ца вакол захоўваньня і аздараў...ьня паравознага парку.

Пытаньні

...нонізацыі і рацыяналізацыі ...нспорту яшчэ не знайшлі па...бнай увагі з боку чыгуначных ...анізацый ня вывучаны розныя ...тэмы язды, не праверана эфэкт...ьць гэтых сыстэм прыстасава...ьці да ўмоў менскага вузла.

Бюракратычныя адносіны, пра...зеньне шкодніцкай „обезличеной" ...ы бяз увязкі з праводзімымі мэ...рыемствамі, з становішчам дэп ...забясьпечваюць правільнай п...ноўкі рамонту паравозаў.

...і гаспадарчыя, ні профэсыйн... ...анізацыі не займаліся захоўвань... важнейшых кваліфікаваных ...эгорый рабочых, спэцыялістых і ...рыхтоўкай новых кадраў.

...ажнейшая прычына

...ялікага проценту хворых пара...аў і дрэннай працы вузла—...давальняючасьць працоўнай дыс...ыпліны. Прафсаюзна-партыйныя ...анізацыі чыгункі ня здолелі па...раўднаму, па-бальшавіцкаму, па...віць на належную вышыню ...аацьбу з парушэньнямі працоўнай ...сцыпліны.

— Яны ня сталі на чале ініцыя...вы актыўнасьці рабочых мас, ...чале барацьбы з разгільдзяй...ам, расхлябанасьцю і рвацтвам ...вытворчасьці.

Павінны зараз-жа

...прафсаюзныя і партыйныя арга...ацыі чыгункі перайсьці да кон...этнага кіраўніцтва барацьбой за ...аяфінплян, бяручы за асноўное ...вяно зьмаганьня за здаровы па...воз і падрыхтоўку кадраў для ...абслугоўваньня, Рашучая ба...цьба за здаровы паравоз, за со...ялістычную і працоўную дысцы...іну, за выразную організацыйную ...руктуру гаспадарчага кіраўніцтва, ...сапраўднае ўдарніцтва і соц. ...аборніцтва—вось неабходныя прад...сылкі разгорнутай соцыялістычнай ...конструкцыі транспорту і выка...ньня транспортнай пяцігодкі ў ...ы гады.

С. Б.

У палоне нядбайнасьці і безадказнасьці

Работа чыгункі, яе гнуткасьць, прыстасаванасьць да па рабаваньняў растучай гаспадаркі і барацьба за поўнае выкананьне транфінпляну зьяўляецца зараз галоўнейшай задачай нашай народнай гаспадаркі.

Барацьба за поўнае і сваечасовае выкананьне транфінпляну ў значнай ступені залежыць ад таго, наколькі апарат транспорту перабудуе сваю работу, наколькі ён прасякне сваю штодзённую працу змаганьнем за транфінплян, наколькі будзе забясьпечана кіраўніцтва гэтай барацьбой.



Прэч гэты цяжар!

Бесьперабойная бальшавіцкая работа нашага транспорту, поўнае і сваечасовае выкананьне транфінпляну будзе мець рашаючае значэньне для пасьпяховага выкананьня пляну народнай гаспадаркі ў 3-м годзе пяцігодкі, для з канчэньня фундаманту нашай соцыялістычнай экономікі.

Вось чаму праца транспорту зьяўляецца адказьнейшым вучасткам народнай гаспадаркі, вось чаму транспорт павінен быць вучасткам самаадданай працы, узорам працоўнага энтузіязму і вытворчай гэроікі.

Працоўная дысцыпліна падае

Прагледзім становішча працы Менскага чыгуначнага вузла, яго прыстасаванасьць да сучасных задач і перабудову яго працы ў адпаведнасьці з лёзунгам—тварам да чыгункі.

За апошнія месяцы працоўная дысцыпліна на вузьле значна зьнізілася. Зрабіліся больш частымі выпадкі грубога парушэньня яе: выхады на работу ў п'яным выглядзе, негаспадарчасьць. павялічыўшая прастоі; нанясеньне матар'яльных страт чыгунцы і шэраг іншых парушэньняў.

На 1-е студзеня г. г. соц. спаборніцтвам і ўдарніцтвам на вузьле ахоплена 56,7 проц, усяго складу працаўнікоў вузла, што зьяўляецца. вядома, недастатковым у момант, калі ставіцца пытаньне аб стопроцантным ахопе ім усіх працоўных.

Калі ў кастрычніку на вузьле было вынесена 56 дысцыплінарных спагнаньняў, дык у лістападзе іх налічвалася ўжо 61, а ў сьнежні лічба дасягнула пагражаючых памераў—95 розных відаў спагнаньняў, што зьяўляецца абураючым фактам сыстэматычнага падзеньня працоўнай дысцыпліны, безадказнасьцю, зьвязанай з нячоткасьцю ў рабоце чыгункі, з зрывам трамфінпляну, зьніжэньнем якасьці выконваемай работы.

Больш увагі кадрам

На вузьле шмат розных курсаў, але праца іх праходзіць неяк абасоблена, іх работай мала хто цікавіцца, мала зьвяртаецца ўвагі на лепшую пастаноўку навучаньня і забясьпечаньне тэхнічнай сілы належнымі прыладамі, надручнікамі. Профсаюзна-партыйным організацыям вузла трэба было ўцяміць усю важнасьць падрыхтоўкі кадраў для чыгункі.

Перабоі ў рабоце вузла павялічваюцца і па віне кліентуры, якая несвасчасова разгружае вагоны, несваечасова вывозіць грузы, што заграмаджае чыгунку, павялічвае нерацыянальныя прастоі, ускладняе і тармозіць грузазварот вузла.

Неабходна безадкладна зьнішчыць абыякія адносіны да чыгункі.

Наглядаюцца частыя спазьненьні ад праўкі цягнікоў, бо арганскае дэпо дрэнна рамантуе паравозы. Часта паравозы з цягнікамі рамантуюцца ў Менску.

Побач з прарывамі і значнымі недахопамі вузел мае некаторыя дасягненьні:

Праграму абточкі паравозаў вузел выканаў на 100 проц., зьменшыўшы пры гэтым затраты на рамонт з 900 чалавека-гадзін да 561

На адзінку рамонту адпушчана 697 рублёў 50 кап., а фактычна рабілі рамонт за 446 руб. 74 кап., што дало 250 руб. 75 кап. экономіі ад кожнай адзінкі.

„Вузкімі цягавымі плячыма"

Вузел здае позыцыі, штомесячна павялічвае процант недавыкананьня прабегу паравозаў, ганебна адстае.

Сярэдні сутачны прабег таварнага паравоза ў кастрычніку вызначаўся 91,5 проц. у лістападзе—97,29 проц., а ў сьнежні—ледзь напягнута 90 проц.

Калі начальніка станцыі, тав. Зантовіча, запыталіся, чым ён тлумачыць недавыкананьне прабегу паравозаў на 9-10 проц., то ён ужыў улюбёны спосаб тлумачэньня і замазваньня сапраўдных прычын: „недавыкананьне тлумачыцца выключна вузкімі цягавымі плячыма".

Не, паважаны тав. Зантовіч, хоць вы і спэц, але вы глыбока памыляецеся! Вы забыліся, хапаючыся за об'ектыўшчыну, пра недарэчнасьці, якія сустракаюцца ў працы вузла. Вы забыліся, што перамога цяжкасьцяй залежыць перш за ўсё ад якасьці работы, уменьня мобілізаваць рабочых на барацьбу за выкананьне прамфінпляну.

Комсамольская організацыя вузла не адчуваецца

Работа комсамольскай організацыі вузла ўсё яшчэ адстае ад запатрабаваньняў транспорту. Праца комсамольскай організацыі чыгункі не перабудавана адпаведна з лёзунгам: „Тварам да чыгункі".

Паглядзім, як комсамольская організацыя вузла перабудавала сваю працу, як ьздзейсьнены па арот. Комсамольскі колектыў вузла займаўся пытаньнямі перабудовы працы толькі на паперы. У свой час сэкратар колектыву, тав. Шымко шмат аб гэтым крычаў, разьбіваўся ў ляпёшку, але фактычна пераламленьня лёзунгу тварам да чыгункі на справе, на вялікі жаль, ня зроблена. Гэтаму перашкодзілі парадпасьць, надмерная шуміха, блізарукасьць, непаваротнасьць, няўменьне перабудавацца на хаду, гэтаму перашкодзілі і наклалі пэўны адбітак формальныя адносіны колектыву да важнейшай справы, да перабудовы работы комсамольскай організацыі вузла. недаацэнка колектывам політычнай сутнасьці перабудовы, правядзеньне працы на авось—па-старынцы.

Пытаньнямі рацыяналізацыі, прапрацоўкі трамфінпляну, соц. спаборніцтва, ударніцтва і падрыхтоўкі кадраў комсамольская організацыя не займалася.

Работу вузла перабудаваць зьверху да нізу

На вузьле праведзены ў жыцьцё шэраг каштоўнейшых рабочых прапаноў.

Галоўнейшыя з іх; устаноўка габлёвага варштага па дзераву, які даў экономіі ў рабсіле—20 проц.; устаноўка варштата для заліўкі падшыпнікаў, павялічыўшая вытворчасьць працы на 20 проц,, рамонт старых турнікетаў і ўстаноўка новых, паскорыўшыя падкатку калёсных пар на 15 хвілін ад кожнай пары, што за месяц дае экономію 720 гадзін, устаноўка амэрыканскага патрона к такарнаму варштату дала экономію 40 проц. Гэта пералічана частка прапаноў, а вялікая колькасьць іх марынуецца ў папках.

Аднак, прапановы праводзяцца ў жыцьцё ўсьляпую. Ніхто ня ведае, які экономічны эфэкт дадуць яны ў параўнаньні з затрачанымі сродкамі. У бліжэйшы тэрмін неабходна ўсю працу чыгуначнага вузла перабудаваць зьверху да нізу, прыстасоўваючы яе да патрабаваньняў сучаснасьці. Неабходна правесьці барацьбу за далейшы ўздым сапраўднага ўдарніцтва і разгортваньне соц. спаборніцтва.

Усямерна дамагацца замацаваньня і ўзьняцьця самадзейнасьці і энтузіязму рабочых мас, як галоўнейшых стымулаў пасьпяховага выкананьня пляваў чыгункі.

Сідарук.

Ганебныя 40 хвілін

Барацьба за сваечасовы адход цягнікоў, за выкананьне вымервікаў ёсьць барацьба за бальшавіцкія тэмпы работы.

Менскі чыгуначны вузел яўна зрывае гэтую барацьбу за тэмпы. Таварныя і пасажырскія цягнікі сыстэматычна адпраўляюцца з „хвосьцікамі", ня прытрымліваючыся графіку.

12 студзеня цягнік № 402 на Асіпавічы адыйшоў на 40 хвілін пазьней раскладу. На Воршу—з такім жа спазьненьнем. Гэта толькі за адзін дзень.

Неабходна павесьці барацьбу за пляпавасьць працы складчых брыгад, за сваечасовую прычэпку вагонаў да пасажырскіх цягнікоў і за сваечасовую адпраўку іх


Зрываецца падрыхтоўка кадраў

У рабоце курсаў на падрыхтоўцы пам. машыністых шмат недарэчнасьцяй.

З 15-га сьнежня 1930 году па 11-ае студзеня 1931 году сарвалася па віне выкладчыка 27 павучальных гадзін, што складае 50 проц. двухтыднёвага пляну. Склад слухачоў кожны дзень мяняецца.

Аддзел кадраў ня кіруе курсамі і не зацікаўлены імі. Гаспадарнікі не надаюць такому становішчу належнага значэньня. Неабходны рашучыя захады.

Ю. Н.



Узьняць працдысцыпліну!

Што будзе?

У малым рамонце вагонаў не хапае вугалю для апалу і забясьпечаньня цягнікоў. Пра гэта добра ведаюць гаспадарнікі, партыйныя і профэсыйныя організацыі, але да гэтага часу ня прынялі ніякіх захадаў, каб гэтыя недарэчнасьці зьнішчыць.

Запасу вугалю ў малым рамонце хопіць толькі на некалькі дзён. Гэта пагражае зрывам рамонту. Што будзе?

Рэдколегія „Ч. Чыг."

Рэзолюцыя IX зьезду УсеЛКСМ па дакладу тав. КАГАНОВІЧА

(Працяг. Пачатак гл. на 1 ай старонцы)

стрыжнёвай і цэнтральнай задачай, прыняць самы энэргічны ўдзел у організацыі работы ўсіх зьвеньняў па падрыхтоўцы кадраў (ФЗУ, каротка-тэрміновыя курсы, тэхнікумы, ВНУ, ВТУ і інш).

9 зьезд добра сабе ўяўляе, што выкананьне пляпаў трэцяга году зьвязана з цяжкасьцямі. Ленінскі комсамол добра разумее характар гэтых цяжкасьцяй, што зьяўляюцца цяжкасьцямі росту і маюць у сваёй аснове перш за ўсё жорсткае супраціўленьне клясавага ворага ўнутры краіны і звонку.

УсеЛКСМ прызнае адзіным шляхам карэннага перамаганьня цяжкасьцяй шлях разгорнутага соцыялістычнага наступу па ўсім фронце супроць капіталістычных элемэнтаў і бязьлітасную барацьбу на два фронты з опортуністымі, у першую чаргу правымі, якія спрабуюць сьцягнуць партыю і комсамол на шлях капітуляцыі перад цяжкасьцямі.

Посьпехі пролетарскай дзяржавы ўзмацняюць нenавісьць і злабу імпэрыялістычнага абкружэньня звонку і клясавага ворага перш на перш кулацтва ўнутры. Ліхаманкавая падрыхтоўка міжнароднага імпэрыялізму да інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу, якая апіраецца ўнутры краіны на сілу кулацтва, якое шалёна супраціўляецца і шкодніцкай часткі верхавіны буржуазных спэцыялістых—патрабуе ад усёй рабочай клясы і моладзі асаблівай дбайнасьці і гатоўнасьці.

Зьезд поўнасьцю і цалкам ухваляе політыку партыі і савецкага ураду—політыку міру. Зьезд лічыць неабходным усямерна ўзьмацняць абароназдольнасьць СССР. Зьезд даручае ЦК УсеЛКСМ забясьпечыць усе неабходныя меры для больш шырокага ўдзелу саюзу ў справе ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР і асабліва ў справе дапамогі гэроічнай Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і Чырвонаму марскому і паветранаму флёту.

Зьезд лічыць немагчымым знаходжаньне ў шэрагах УсеЛКСМ людзей, недаацэньваючых ваеннай небясьпекі, не праходзячых вайсковай вучобы, не падрыхтоўваючых сябе да надыходзячых баёў. Заклікаючы ўсю працоўную моладзь сьвету пад кіраўніцтвам Комінтэрну і Кім'у рашуча змагацца супроць вайны за абарону СССР, зьезд заяўляе ад імя мільёнаў працоўнай моладзі СССР, што комсамол і кіруемая ім моладзь Савецкага Саюзу ў гэтым змаганьні з імпэрыялізмам будуць у першых шэрагах самаадданых барацьбітоў соцыялізму і сусьветнай пролетарскай рэволюцыі.

9-ты зьезд комсамолу са здаваленьнем адзначае, што паўгода, мінуўшыя з часу XVI партзьезду, цалкам і поўнасьцю пацьвердзілі правільнасьць ацэнкі сусьветнага становішча, данай у рэзолюцыі зьезду і ў рашэньнях Комінтэрну. Мінулы пэрыод з асаблівай рэзкасьцю падкрэсьліў карэнную розьніцу паміж узрастаючай соцыялістычнай сыстэмай СССР разьвіваемымі супярэчнасьцямі, якія яшчэ больш узмацняюцца крызісам капіталістычнай сыстэмы. У нас нябывалы ўздым прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, у іх далейшае зьніжэньне вытворчасьці. У нас ліквідацыя беспрацоўя, у іх новыя мільёны беспрацоўных ва ўсіх краінах. У нас рост дабрабыту рабочай клясы, у іх далейшае наступленьне прадпрыемцаў на галодны ўзровень зарплаты, лёкауты, няпоўны рабочы тыдзень, павялічаны рабочы дзень.

Сусьветны крызіс нашчэнт разьбіў тэорэтычныя пабудовы соцыял-здраднікаў і іх права-опортуністычных падгалоскаў аб організаваным капіталізьме. Экономічны крызіс выклікае да рэволюцыйнай актыўнасьці рабочай клясы і прыгнечаных народаў колёніяльных і паўколёніяльных краін і перарастае ў радзе краін у крызіс політычны.

IX зьезд з асаблівым здаваленьнем адзначае ленінскую пасьлядоўнасьць і правільнасьць лініі Комінтэрну, УсеКП(б) і яе ЦК у справе ўзмацненьня і разьвіцьця міжнароднага рэволюцыйнага руху і цалкам падтрымлівае барацьбу Комінтэрну супроць опортунізму на два фронты.

Насьпяваюць новыя вялікія клясавыя сутычкі. Пад ленінскім кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі пролетарыят і працоўныя масы нашай краіны ўпартаю працаю на пастох пяцігодкі мацуюць фронт будучай сусьветнай і пролетарскай рэволюцыі. Комсамол і кіруемае ім маладое пакаленьне рабочых і сялян быў, ёсьць і будзе першым памочнікам партыі, самаадданым дапаможнікам у яе гэраічнай барацьбе, пасьлядоўным праваднікам яе ленінскай лініі, непрымірымым байцом з клясавым ворагам і яго опортуністычнай агентурай.

Няхай дрыжаць ворагі пролетарыяту, маючы супроць сябе шматмільённую армію ўзрастаючага і перамагаючага соцыялізму.

Няхай вышэй узьнімаюцца чырвоныя сьцягі партыі Леніна ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве партыя бальшавікоў, якая вядзе рабочую клясу нашай краіны ад перамогі да перамогі — насустрач будучаму сусьветнаму Кастрычніку.

Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)—організатар перамог соцыялізму.

Няхай жыве выпрабаваны, непарушны бальшавік, лепшы кіраўнік і правадыр партыі і комсамолу—т. Сталін.

ФРАНЦУСКІ ГЕНШТАБ ПРЫНЯЎ КАМАНДВАНЬНЕ АРМІЯМІ ІНТЭРВЭНТАЎ

Згодна польска-румынскай ваеннай умове, генэрал Гуро выяжджае ў Бухарэст для камандваньня інтэрвэнцкімі арміямі

У адказ на шалёную падрыхтоўку інтэрвэнцыі імпэрыялістых супроць СССР—мацуйма абароназдольнасьць краіны, сувязь з Чырвонай арміяй і шэфства над флётам, вывучайма вайсковую справу

Выкрыцьці італьянскага друку

РЫМ,—У „Лявора фашыста“ надрукавана корэспондэнцыя з Жэнэвы аб польска-румынскай ваеннай ўмове. Корэсподэнт заяўляе, што яму давялося атрымаць з аўторытэтных крыніц інформацыю аб сутнасьці ўзьнікшых пры заключэньні ўмовы рознагалосьсяў.

Польшча патрабавала, каб ёй было прадастаўлена кіраўніцтва штабам вышэйшага камандваньня польскай і румынскай арміямі і каб штаб знаходзіўся ў Варшаве. Польшча матывавала сваё патрабаваньне тым, што яе позыцыя ў адносінах СССР зьяўляецца іншай, чымся позыцыя Румыніі, і што на яе падае нібыта галоўны цяжар прадугледжваемых умовою абавязкаў. Румынія, аднак, адмовілася задаволіць патрабаваньні Польшчы, спрэчкі былі вырашаны ўмяшаньнем Францыі.

Корэспондэнт паведамляе, што вышэйшае камандваньне польскай і румынскай арміямі перадана француcкаму генэральнаму штабу. „Так,—працягвае корэспондэнт,—і гэты вучастак Усходняй Эўропы будзе знаходзіцца пад кантролем Францыі, падобна таму, як вярхоўнае камандваньне войскамі Малой Антанты даручана францускаму генэралу Нольле.

Месцам знаходжаньня новага аб'яднага камандваньня арміямі Польшчы і Румыніі намечан Бухарэст, а само вярхоўнае камандваньне даручана генэралу Гуро, які ў бліжэйшы час накіроўваецца ў Румынскую сталіцу.

Павялічваюць асыгнаваньні на ваенныя патрэбы

ВАРШАВА, 24. Бюджэтная камісія польскага сойму займалася сёньня вельмі далікатным пытаньнем разглядам польска-ваеннага бюджэту, які мае тую асаблівасьць, што, апрача офіцыйных лічбаў ваенных выдаткаў, існуюць яшчэ неофіцыйныя, якія складаюць за тры апошнія бюджэты суму каля мільярда злотых, не лічачы выдаткаў на ваенныя патрэбы, што ўваходзяць у бюджэт іншых ведамстваў.

З надзвычайна скупой справаздачы, складзенай комісіяй для друку, відаць, што ў 1926-27 г. г. офіцыйны ваенны бюджэт вызначаўся лічбай у 554 млн. У наступным годзе ваенны бюджэт даў адразу скачок на 268 млн. і на гэтым узроўні (822 млн.) трымаецца аж да бягучага году. Паміж тым, у зьвязку з прамысловым і сельска-гаспадарчым крызісам, цэны ўнутры краіны сільна палі, і ў прыватнасьці жыта, якое раней закупалася для арміі па 46,3 зл. за квінтал, сёлета закупаецца ўсяго па 15 злотых. У зьвязку з падзеньнем цэн адваротна-пропорцыянальна павялічваецца і магчымасьць пашырэньня ўзброеньняў польскай арміі. Рэальна, па самых скромных падліках, офіцыйны ваенны бюджэт, у параўнаньні з мінулым годам, узрос прынамсі на 100 млн. злотых, г. зн. дасягае амаль 1 млд.

Аб скарачэньні гэтай вялізнай лічбы, ня гледзячы на нерэальнасьць агульна-дзяржаўнага бюджэту, прызнанага і міністрам фінансаў Матушэўскім, ваеннае ведамства ня толькі ня думае, але наадварот, вуснамі свайго прадстаўніка заяўляе, што бюджэт хутка павінен быць павялічаны яшчэ больш. Пасьля спрэчак, аб якіх скупа паведамляе справаздача бюджэтнай камісіі, „левая опозыцыя“, не супярэчачы супроць павялічэньня ваеннага бюджэту, унесла для ачысткі сумненьня вэгетар'янскую прапанову аб скарачэньні колькасьці арміі.

У Нямеччыне 4.765.000 беспрацоўных

БЭРЛІН, 24.—За першую палову студзеня агульная лічба беспрацоўных у Нямеччыне павялічылася на 408.000 і дасягнула 4 мільёнаў 765 тысяч, г. зн. у параўнаньні з мінулым годам узрасло больш, чым на паўтара мільёны чалавек. З 4.765.000 беспрацоўных толькі 3.120.000 атрымліваюць дапамогі.

Урадавы крызіс ва Францыі

ПАРЫЖ, 23.—Як і пасьля падзеньня габінэту Тард'е, так і зараз, пасьля ўходу ўраду Стэга, парляманцкія колы стаяць перад цяжка вырашаемай проблемай стварэньня новага ўраду. Парляманцкі вопыт апошняга часу з бясумоўнасьцю паказаў, што хістаньні такіх цэнтрысцкіх груп, як „левыя радыкалы“ (група Лушэра) і „левыя рэспубліканцы“ (група Тард'е) робяць немагчымым стварэньне трывалага ўраду.

Комсамол—шэф электрофікацыі... ...ЯК АЖЫЦЬЦЁВІЦЬ ГЭТАЕ ШЭФСТВА?

З мэтай абгаварыць конкрэтныя формы працы комсамолу па ажыцьцяўленьню шэфства над электрофікацыяй, ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ склікаюць 28 студзеня, а 6 гадзіне ўвечары у памяшканьні ЦК ЛКСМБ нараду па гэтаму пытаньню.

На нараду выклікаюцца—дырэктар, сэкратар ячэйкі КП(б)Б і бюро ячэйкі КСМ—ВЭО і СЭО і тэхнікі гэтых устаноў; прадстаўнікі колектыву заводу „Энэргія“, Эльводу, гар'ому комсамолу; прадстаўнікі колектываў заводаў „Комунар“, „Бальшавік“ і ўсіх тых прадпрыемстваў, пры якіх існуюць электростанцыі. Запрашаюцца спэцыялісты. Яўка выклікаемых абавязкова. ЦК ЛКСМБ, „Чырв. Зьмена“

Ня менш 40.000 „Чырвонкі“

Мазырскі, Лоеўскі, Пухавіцкі, Межынскі, Расьнянскі і Шклоўскі РК ЛКСМБ —кандыдаты на чорную дошку

Выканаем рашэньні Кастрычнікаўскага пленуму ЦК ЛКСМБ аб 40.000 тыражы „Чырвонай Зьмены“

Першы крок у галіне мобілізацыі комсамольцаў па распаўсюджваньню „Чырвонай Зьмены“ быў зроблен на кастрычнікаўскім пленуме ЦК ЛКСМБ. Удзельнікі пленуму склалі з рэдакцыяй сопмову, якою ўзялі на сябе абавязак давесьці тыраж „Чырвонай Зьмены“ да 40.000.

Пасьля пленуму шэраг комсамольскіх ячэек і камітэтаў па-бальшавіцку, з комсамольскім запалам, уступілі ў бой за 40.000-ны тыраж „Чырвонкі“. У выніку—шэраг організацый ня толькі выканалі, а перавыканалі заданьне па падпісцы на „Чырвонку“. Да такіх організацый адносяцца: Рагачоўскі р-н, які заданьне па падпісцы на студзень м-ц выканаў на 300 проц., Слуцкі р-н,—на 200 проц. замест 1000 экзэмпляраў выпісана 2046, Самахвалавіцкі р-н—на 200 проц., Койданаўскі—замест 400 экзэмпляраў даў 643 і Лёзьненскі замест—200 экзэмпляраў даў 431. Гэтыя організацыі павінны не пасьлабіць тэмпаў па распаўсюджваньню „Ч З“.

Побач з гэтымі раёнамі ёсьць і такія, якія цягнуць тыраж „Чырвонай Зьмены“ ўніз, а-за іх заданьне 40.000 тыражу „Чырвонкі“ на студзень месяц ня было выканана.

Да такіх дадаюцца тыражу „Чырвонай Зьмены“ а разам з гэтым і соц. умовы, складзенай на Кастрычнікаўскім пленуме, адносяцца раёны: Мазырскі—замест 1500 экзэмпляраў даў 273. Лоеўскі—замест 150 даў 54, Пухавіцкі—замест 300—185. Межынскі—замест 100 даў 40, Расьнянскі—замест 200 даў 68 і Шклоўскі—замест 200 даў 111.

І толькі па віне гэтых організацый і ім падобным студзень месяц даў 38.000 экзэмпляраў, замест 40.000.

Такое становішча нікуды ня варта, яно гаворыць аб тым, што толькі 1/3 комсамольскай організацыі БССР выпісвае „Чырвонку“

Комсомольскія ячэйкі і камітэты павінны неадкладна разгарнуць работу, каб ня толькі выканаць, але і перавыканаць складзеную на пленуме па пытаньню распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены“ соц. умову.

З рук вон дрэнна

Падпіска на „Чырвоную Зьмену“ ў Аршанскай профтэхшколе знаходзіцца ў заняпадзе. З 300 вучняў „Чырвоную Зьмену“ выпісваюць і чытаюць толькі каля 50 чалавек.

Трэба падкрэсьліць, што ў гэтым вінаваты і цахавыя ўпаўнаважныя тав. Дубнікаў і Ананьеў.

Так, напрыклад, за 23 дні сьнежня падпішчыкі другое клясы атрымалі 9 нумароў „Чырвонай Зьмены“

Наогул трэба сказаць, што бюро колектыву ЛКСМ профтэхшколы ніякіх захадаў да распаўсюджваньня „Чырвонай Зьмены“ ня прымае.

Аршанскі РК ЛКСМБ павінен высьветліць гэтую справу.

ДВОЕ

„Чырвоную Зьмену“ выпісвае адзін толькі...сэкратар ячэйкі

Комсамольская ячэйка Кармянскай школы колгаснай моладзі ніякае работы па распаўсюджаньню друку і ў прыватнасьці комсамольскага не праводзяць.

„Чырвоную Зьмену“ выпісвае толькі... адзін сэкратар ячэйкі.

Ячэйка ня вылучыла нават упаўнаважанага па распаўсюджваньню друку.

Гэта ні куды ня варта. Мы патрабуем ад Кармянскага РК ЛКСМБ высьветліць справу і прыняць адпаведныя захады.

Г. Т.

„Прыняць да ведама“

Любаньскі РК ЛКСМБ даў заданьне Тальскай ячэйцы комсамолу распаўсюдзіць 30 экзэмпляраў газэты „Чырвоная Зьмена“, але на сходзе ячэйкі, дзе гэтае пытаньне стаяла у бягучых справах, па прапанове сэкратара ячэйкі пастанавілі—„прыняць да ведама“ заданьне РК ЛКСМБ. Падпіска пасьля казённай пастановы не кранулася з месца.

Б.

Змагаемся за 40.000

Комсамольскі колектыў разам з беспартыйнай моладзьдзю Добрушскай Цэнтральнай школы ФЗВ—папернікаў горача адклікнуліся на заклік рэдакцыі „Чырвоная Зьмена“ аб 40.000 тыражы газэты. На студзень месяц было выпісана 330 экзэмпляроў газэт, з якіх 180 „Чырвоная Зьмена“ і 100 „Комсамольскай Праўды“.

Крыстол Д.
Локшын.

Паведамленьні

—28-га студзеня, а 6-ай гадзіне 30 хвілін адбудзецца сход агульнагарадзкога колектыву павадыроў піонэрскіх атрадаў і баз.

Яўка абавязковая.

Менгарбюро ДКА.—

—31—1—31 году, а 7-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні НК РСІ (Савецкая 55, другі паверх, пакой № 9) адбудзецца нарада актыву Бюро скаргаў, „Лёгкай Кавалерыі“ і дабраахвотнікаў.

Яўка ўсіх таварышоў абавязкова.

Заг. бюро скаргаў

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599